ВЕСЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ № 2 2007
СЕРЫЯ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК

# ГІСТОРЫЯ

УДК 946.7

С. Я. НОВІКАЎ

## ЭКАНАМІЧНАЯ ПАЛІТЫКА НАЦЫСЦКАЙ ГЕРМАНІІ НА АКУПАВАНАЙ ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (1941–1944 ГГ.)

*Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт*

*(Пастутіў у рэдакцыю 07.06.2005)*

Плануючы нападзенне на СССР, вярхоўнае камандаванне ўзброеных сіл Германіі намячала правесці ў адносінах да савецкай дзяржавы не толькі самую буйную ваенна-стратэгічную аперацыю, але і найбольш шырокамаштабную ў гісторыі сусветных войнаў эканамічную экспансію.

Беларусь у перыяд Вялікай Айчыннай вайны, як паказваюць новыя арыгінальныя дакументы, уяўляла сабой унікальны ваенна-эканамічны *феномен*, сутнасць якога была вызначана нацысцкай эканамічнай палітыкай і германскай практыкай «вядзення гаспадаркі» на акупаваных беларускіх землях у 1941–1944 гг.

У ходзе падрыхтоўкі ваеннай аперацыі «Барбароса» кіраўніцтва Трэцяга рэйха разглядала эканамічны патэнцыял СССР у якасці аднаго з галоўных стратэгічных аб'ектаў. Аб магчымасці яго максімальна поўнага выкарыстання ў мэтах умацавання эканомікі Германіі сведчыць цэлы шэраг дырэктыўных рашэнняў, сярод якіх асобнае месца займае стварэнне спецыяльнай эканамічнай арганізацыі з аднайменным штабам асобнага прызначэння «Ольдэнбург» (Wi Stab Ost з чэрвеня 1941 г.) [1, Bl. 14.]. Ваенна-эканамічныя разлікі будучай ваеннай аперацыі праводзіў «Штаб па кіраўніцтву эканомікай» (Wi Rue Stab Ost – «Усход»), падпарадкаваны ўпаўнаважанаму па чатырохгадовым плане рэйхсмаршалу Г. Герынгу, а таксама іншыя дзяржаўныя ўстановы.

Плануючы ваенную аперацыю, германскае вышэйшае ваенна-эканамічнае кіраўніцтва зыходзіла з указанняў Гітлера аб палітыцы і метадах дзеяння спецыяльных выканаўчых органаў на тэрыторыі «лебенсраўма» з той толькі мэтай, каб «неадкладна і цалкам выкарыстаць» усходнія вобласці ў інтарэсах рэйха, і ў «першую чаргу для атрымання харчавання і нафты». Першачарговай задачай павінна было стаць харчовае забеспячэнне «ўсіх узброеных сіл Германіі за кошт Расіі».

Зыходзячы з ваенна-эканамічных указанняў нацысцкага кіраўніцтва, вызначаліся асноўныя метады дасягнення пастаўленых мэтаў. 2 мая 1941 г. на нарадзе дзяржаўных сакратароў урада Германіі было засведчана: «калі мы здолеем выпампаваць з краіны ўсё, што нам неабходна, дык дзесяткі мільёнаў чалавек будуць асуджаны на голад» [2, s. 323].

Беларусь бачылася ў першапачатковых германскіх ваенна-эканамічных разліках як крыніца сельскагаспадарчай прадукцыі і тэхнічных культур. Канкрэтныя задачы па выкарыстанні рэсурсаў вызначаліся «Агульнымі палітыка-эканамічнымі дырэктывамі для эканамічнай арганізацыі «Усход» 23 мая 1941 г.: з беларускай тэрыторыі, якая ўваходзіла ў «лясную зону», планавалася атрымаць «значныя мясныя запасы» [3, s. 65]. Пры гэтым тэрыторыя Беларусі павінна быць аддзелена ад чарназёмнай зоны СССР, дзе меліся лішкі прадуктаў. Магчымы недахоп прадуктаў харчавання ў гэтай паласе не азначаў іх абавязковую пастаўку з чарназёмных раёнаў ці з самой Германіі, паколькі распрацоўшчыкі дырэктыў бачылі першараднай задачай харчовае забеспячэнне вермахта.

У аснову распрацоўкі «праграмы» забеспячэння вайсковых часцей з «рэсурсаў занятай краіны», як згадвалася ў дырэктывах, неабходна было пакласці метад не «павышэння ўраджайнасці,

а зніжэння памераў ужывання» для мясцовага насельніцтва. Якраз такі разлік стваральнікі дакументаў бралі на ўзбраенне, калі шукалі найбольш рацыянальны шлях для атрымання лішкаў харчавання і фуражу, неабходных для Германіі ў ходзе ваеннай аперацыі на ўсходзе, аддаючы тым самым на голад мільёны людзей.

Непасрэднымі выканаўцамі прынятых дырэктыў павінны былі стаць «сельскагаспадарчыя кіраўнікі (фюрэры)», якім нацысцкае кіраўніцтва давала поўную свабоду пры выбары сродкаў для харчовага забеспячэння вермахта з рэсурсаў занятай краіны. Паводле спецыяльнай інструкцыі, – «12 запаведзей паводзін немцаў на ўсходзе і іх абыходжання з рускімі», прынятай 1 чэрвеня 1941 г., – будучым сельскагаспадарчым кіраўнікам прадпісвалася «праводзіць самыя жорсткія і бязлітасныя мерапрыемствы», выкарыстоўваць «любыя метады» дзеля таго, каб забяспечыць выкананне дырэктыўных задач па асваенні ўсходніх зямель і атрыманні лішкаў харчавання з савецкіх тэрыторый.

Галоўным праграмным дакументам, якім вызначаліся важнейшыя мэты і задачы па эканамічнай эксплуатацыі «жыццёвай прасторы на ўсходзе», сталі «Дырэктывы па вядзенні гаспадаркі на новазанятых усходніх тэрыторыях (Зялёная папка)», вядомыя ў айчыннай гістарыяграфіі як «Зялёная папка» Г. Герынга [4]. Прынятыя 16 чэрвеня 1941 г., г. зн. за тыдзень да ўзброенага нападзення на Савецкі Саюз, дырэктывы прызначаліся для арыентацыі ваеннага кіраўніцтва і ўсіх гаспадарчых інстанцый; мелі сілу ў раёнах, якія будуць знаходзіцца пад кіраўніцтвам як ваеннай, так і цывільнай адміністрацый.

У дакуменце канкрэтна акрэслена значэнне эканамічнага патэнцыялу Беларусі. З яе тэрыторыі ваенна-гаспадарчыя службы разлічвалі атрымаць запасы буйной рагатай жывёлы, ячменю, коней, лесу і інш., а таксама выкарыстаць рабочую сілу, ваеннапалонных і прыцягнуць мясцовае насельніцтва для выканання нарыхтоўчых заданняў.

Дакументы, вядомыя нам сёння, дазваляюць устанавіць наступнае: дырэктыўныя ўказанні і распараджэнні, выкладзеныя ў «Зялёнай папцы», шматразова зменены і перавыдадзенай, захоўвалі сваю практычную значнасць да заканчэння ўсходняй кампаніі. Аднак пасля правалу «бліцкрыгу» берлінскія стратэгі вымушаны былі ўносіць істотныя карэктывы ў акупацыйную палітыку на ўсходзе, у тым ліку і ў практыку «вядзення гаспадаркі». З таго часу ў аснову работы германскіх гаспадарчых органаў і службаў былі пакладзены «агульныя прынцыпы эканамічнай палітыкі на новазанятых усходніх тэрыторыях» [5, Bl. 42–51]. У адпаведнасці з унесенымі зменамі вышэйшым законам далейшага вядзення вайны нацысцкае кіраўніцтва аб'яўляла «патрэбы ваеннай эканомікі», да ліку якіх разам з сельскай гаспадаркай уключалася аднаўленне прамысловай вытворчасці, але перш за ўсё – выкарыстанне людскіх рэсурсаў з захопленай тэрыторыі СССР.

Сярод іншых дакументаў, якія мелі важнае значэнне для ажыццяўлення германскай эканамічнай палітыкі на акупаванай тэрыторыі Беларусі, той яе большай часткі, што знаходзілася ў зоне дзейнасці так званай цывільнай адміністрацыі, асаблівае месца займала «Карычневая папка», ці «Дырэктывы па вядзенні гаспадаркі» [6], да апошняга часу ў поўным аб'ёме практычна не вядомая айчыннаму чытачу. Падрыхтаваныя ўвосень 1941 г., але ўведзеныя толькі з красавіка 1942 г., дырэктывы датычыліся перш за ўсё сферы цывільнага кіравання на тэрыторыі рэйхскамісарыятаў «Остланд» і «Украіна», у склад якіх на працягу лета-восені 1941 г. былі ўключаны іншыя часткі (заходняя і паўднёвая) акупаванай тэрыторыі Беларусі. Адсюль планавалася пастаянна атрымліваць такія віды сельгаспрадукцыі, як бульба, жыта, лён, каноплі, воўна, таксама матэрыялы дрэваапрацоўкі і інш. Да таго ж, у сферу дзейнасці цывільнай адміністрацыі ўваходзілі пытанні агульнага вядзення гаспадаркі, у тым ліку планавання і гаспадарчага абнаўлення вытворчасці, арганізацыі перапрацоўкі сельскагаспадарчай сыравіны, паставак прадукцыі для вермахта, выкарыстання мясцовай рабочай сілы.

Непасрэднымі выканаўцамі «Дырэктыў па вядзенні гаспадаркі» на акупаванай тэрыторыі Беларусі з'яўляліся гаспадарчыя службы, якімі ў ходзе выканання дырэктыў быў прыняты шэраг загадаў, распараджэнняў і планаў, праз што прадугледжвалася «аднаўленне эканомікі ў генеральнай акрузе Беларусь», выкананне «першага эканамічнага плана для Беларусі», забеспячэнне «татальнай мабілізацыі прамысловасці Беларусі», а таксама «вядзенне аграрнага парадку», «рацыяналізацыя вытворчасці» [7] і інш. Прынятыя ўказанні, як адзначалі служачыя гаспадарчых каманд, «служылі атрыманню ўсяго, што мае руская зямля».

Такім чынам, у ходзе падрыхтоўкі і непасрэднага правядзення ваеннай агрэсіі супраць СССР вышэйшым кіраўніцтвам нацысцкай Германіі былі распрацаваны дырэктыўныя дакументы, якія спалучалі ў сабе, з аднаго боку, ваенна-стратэгічныя і ваенна-эканамічныя разлікі, а з другога – нацысцкія метады злачыннай ідэалогіі вайны на вынішчэнне мірнага насельніцтва на ўсходніх тэрыторыях. Выяўленыя дакументальныя матэрыялы дазваляюць прыйсці да высновы: Беларусь з яе гаспадарчымі і людскімі патэнцыяламі аказалася ў ваенна-эканамічных разліках трэцяга рэйха і да вызвалення летам 1944 г. з'яўлялася адным з аб'ектаў па эканамічнай эксплуатацыі для цэлага рада службаў, каманд і аддзелаў германскіх акупацыйных органаў улады.

З першых дзён германскай ваеннай агрэсіі супраць СССР уступалі ў сілу «Дырэктывы па вядзенні гаспадаркі на новазанятых усходніх тэрыторыях (Зялёная папка)», якія, як падкрэслівалася ў распараджэнні начальніка штаба вярхоўнага камандавання вермахта В. Кейтэля, павінны былі «*выконвацца ўсімі вайсковымі часцямі*» [8]. У адпаведнасці з дырэктыўным дакументам галоўнаму камандаванню арміямі і ваенна-гаспадарчым службам часцей вермахта належала прыняць усе меры па тэрміновым і поўным выкарыстанні занятай усходняй тэрыторыі.

Фактычна праз тры тыдні пасля пачатку аперацыі «Барбароса» тэрыторыя Беларусі з яе эканамічным патэнцыялам і людскімі рэсурсамі аказалася галоўным аб'ектам для цэлага шэрагу ваенна-гаспадарчых органаў, у тым ліку: 3 гаспадарчых аддзелаў (IV Wi) пры галоўнакамандуючых арміямі; 7 гаспадарчых груп (Grupре IV Wi) пры палявых камендатурах, а таксама 4 гаспадарчых каманд (Wi Kdos) з трыма філіяламі пры гаспадарчай інспекцыі (Wi In) «Цэнтр», створанай у Нова-Барысаве і задзейнічанай у тылавым раёне групы армій «Цэнтр» (Mitte) [9, Bl. 81–87].

Паводле дырэктыўных указанняў, гаспадарчая інспекцыя з падпарадкаванымі ёй службамі групы армій «Цэнтр» была абавязана аператыўна наладзіць харчовае забеспячэнне вайсковых часцей вермахта, агульная лічба якога толькі на гэтай тэрыторыі ў канцы лета перавышала 1,5 млн чалавек. Галоўнай «выканаўчай сілай па выкарыстанні занятай краіны», як адзначалася ў дырэктывах, станавіліся гаспадарчыя каманды: разам з вырашэннем задач па харчовым забеспячэнні яны адказвалі за прыцягненне рабочай сілы, аднаўленне прамысловай вытворчасці, нарыхтоўку сыравіны і апрацоўку матэрыялаў, вядзенне лясной гаспадаркі і дрэваапрацоўку, арганізацыю банкаўскай справы і гандлю. Кожную каманду складалі аддзелы і пададдзелы, створаныя з мэтай забеспячэння як часцей вермахта, так і іншых падраздзяленняў, у тым ліку часцей войск СС і паліцыі.

Дзейнасць гаспадарчай інспекцыі «Цэнтр» пачынаецца з 12 ліпеня 1941 г. – даты выхаду асобнага распараджэння № 1. У адпаведнасці з дакументам уся занятая да таго часу тэрыторыя Беларусі ўваходзіла ў сферу дзейнасці гаспадарчых каманд «Белгард» (Мінск), «Хіршберг» (Віцебск), «Бунцлаў» (Бабруйск), «Швейдніц» (Орша), якія прадвызначаліся ў далейшым для выканання сваіх функцый на расійскай тэрыторыі з улікам сваіх назваў: «Хіршберг=Масква» (Hirschberg=Moskau), «Бунцлаў=Тула» (Benzlau=Tula) і «Швейдніц=Горкі» (Schweidniz=Gorkij). Колькасны склад каманд вагаўся ад 200 да 600 служачых. Большасць з іх уваходзіла ў склад груп «сельская гаспадарка», якія непасрэдна адказвалі за харчовае забеспячэнне часцей вермахта. Напрыклад, на тэрыторыі дзейнасці гаспадарчых каманд «Орша», «Бабруйск» і «Віцебск» гэтым займалася амаль палова ад агульнага складу гаспадарчай інспекцыі «Цэнтр» [10, Bl. 116].

Першай гаспадарчай камандай, якая з ліпеня 1941 г. пачала выконваць «дырэктывы па вядзенні гаспадаркі» на акупаванай тэрыторыі Беларусі, была каманда «Белгард=Мінск» (Belgard= Minsk). Яна складалася з асобных выканаўчых груп: «кіраўніцтва», «узбраенняў» і «гаспадарка», усяго з 32 служачых. У самую вялікую групу «сельскай гаспадаркі» ўваходзілі 128 чалавек, з якіх: аграномаў – 79, акруговых і раённых упаўнаважаных па сельскай гаспадарцы – 26, манцёраў – 9 і іншыя спецыялісты.

Да пачатку восені 1941 г. амаль палова Беларусі на ўсход ад Барысава (т. зв. тылавы раён) стала зонай дзейнасці трох гаспадарчых каманд, якія разам з камандай «Белгард» займаліся харчовымі пастаўкамі з тэрыторыі дзвюх нарыхтоўчых акруг – «Варшава» і «Цэнтр» (Днепр) з апорнымі пунктамі ў Варшаве, Оршы і Смаленску.

Пасля разгрому германскіх войскаў пад Масквой, калі канчаткова пацярпела крах стратэгія «маланкавай вайны», ваенна-эканамічнае кіраўніцтва Трэцяга рэйха ўносіць «прынцыповыя»

змяненні ў эканамічную палітыку ў дачыненні да ўсіх усходніх тэрыторый, дзе з гэтага часу «галоўным з'яўлялася *вытворчасць* (выдзелена мной. – *С. Н.*) харчавання і здабыча сыравіны» [11, Bl. 42]. У сувязі з гэтым больш чым удвая павялічваецца колькасць гаспадарчых каманд (з 4 да 9), якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі. Апрача таго, на тэрыторыі армейскага тылу, куды з пачатку 1942 г. была ўключана паўночна-ўсходняя частка Віцебскай вобласці, пачалі пошукавую работу спецыяльныя армейскія нарыхтоўчыя каманды (WEK). Як вынік, у 1942 г. усходняя частка Беларусі трапляе ў сферу прамых інтарэсаў 14 (з 39) выканаўчых ваенна-гаспадарчых суб'ектаў, якія дзейнічалі на тэрыторыі толькі 2 (з 7. – *С. Н.*) адміністрацыйна-гаспадарчых зон.

Паводле дакументальных крыніц можна канстатаваць: з першых дзён аперацыі «Барбароса» тэрыторыя Беларусі з'яўлялася аб'ектам дзеяння армейскіх гаспадарчых аддзелаў, гаспадарчых каманд і іх філіялаў, а таксам нарыхтоўчых службаў, гаспадарчых аддзелаў галоўнага кватэрмайстра, ахоўных дывізій і палявых камендатур. Пры гэтым германскія гаспадарчыя структуры ўсіх узроўняў кіраваліся дырэктыўнай формулай – забеспячэння «жыцця з краіны». Па ацэнцы савецкіх даследчыкаў М. М. Загарулькі і А. Ф. Юдзянкова, на часова акупаванай тэрыторыі СССР была ўсталявана «цэлая сістэма» эканамічнага рабавання [12, с. 125].

Большая частка гаспадарчых структур дзейнічала на тэрыторыі Беларусі, якая знаходзілася ў складзе рэйхскамісарыятаў «Остланд» і «Украіна»: калі пад кантролем 9 гаспадарчых каманд і 5 філіялаў была ўсходняя частка тэрыторыі Беларусі агульнай плошчай 110 тыс. км$^2$, а на астатніх (заходняй і паўднёвай) частках тэрыторыі Беларусі (пад кіраўніцтва цывільнай адміністрацыі трапілі на працягу жніўня–кастрычніка 1941 г.) пачалі сваю работу больш за 20 гаспадарчых аддзелаў, ці т. зв. рэфератаў у генеральных і акруговых камісарыятах.

Наяўныя дакументы, уведзеныя ў навуковы ўжытак толькі ў апошні час, дазваляюць вызначыць колькасны і якасны склад галоўных выканаўчых органаў цывільнай адміністрацыі – гаспадарчых аддзелаў: асноўныя сілы канцэнтраваліся ў аддзелах «сельская гаспадарка і харчаванне» гебітскамісарыятаў, а таксама ў акруговых і раённых зямельных упраўленнях. На мясцовым узроўні галоўнай апорай цывільных гаспадарчых структур былі сельскія, валасныя і раённыя ўправы як нізавыя выканаўчыя звёны ў кіраванні кожным з гебітскамісарыятаў.

Усяго за час германскай акупацыі ў аддзелах сельскай гаспадаркі і харчавання на тэрыторыі двух генеральных камісарыятаў (уключаючы Жытомір) былі заняты 360 чалавек, што складала амаль палову ўсіх нямецкіх служачых цывільнай адміністрацыі (да пачатку восені 1943 г. 16% складу загінула на тэрыторыі Беларусі). У гебітскамісарыятах Глыбокае, Баранавічы, Слонім, Вілейка і Слуцк практычна палова штату былі сельскагаспадарчыя фюрэры, якія выкарыстоўвалі таксама мясцовых спецыялістаў для выканання дырэктыў па вядзенні сельскай гаспадаркі.

Для вырашэння задач, звязаных з харчовым забеспячэннем вермахта, вышэйшым ваенна-эканамічным кіраўніцтвам Германіі была створана асобная выканаўчая структура – Цэнтральнае гандлёвае таварыства «Усход» па нарыхтоўцы і збыту сельскагаспадарчай прадукцыі (ЦГТ «Ост» з абмежаванай адказнасцю). У адпаведнасці з указам упаўнаважанага па чатырохгадовым плане Герынга ад 27 ліпеня 1941 г., дзяржаўна-манапалістычнае аб'яднанне прадвызначалася для дзейнасці на ўсёй акупаванай тэрыторыі, выключаючы зону армейскага аператыўнага тылу. Кіраўніцтву ЦГТ ставілася галоўная мэта па выкарыстанні занятых тэрыторый для гарантаванага забеспячэння харчаваннем дзеючых вайсковых часцей [13].

Шляхі вырашэння пытанняў выкарыстання рабочай сілы, нарыхтоўкі харчавання і арганізацыі транспарту кіраўніцтва ЦГТ «Усход» бачыла ў шчыльным супрацоўніцтве з цывільнай і ваеннай адміністрацыямі, а таксама з гаспадарчымі камандамі, службамі і аддзеламі. Апрача таго, на тэрыторыі рэйхскамісарыятаў «Остланд» і «Украіна», а таксама вобласці глыбокага армейскага тылу былі створаны галоўныя і камерцыйныя канторы ЦГТ «Усход». Адна з галоўных кантор знаходзілася ў Нова-Барысаве. Планавалася, калі «бліцкрыг» паспяхова завершыцца, перамясціць яе ў Маскву. Але да мая 1944 г. яна заставалася ў Беларусі. Да таго ж, барысаўская кантора кіравала камерцыйнымі канторамі ў Оршы, Бабруйску, Віцебску, Смаленску і Арле. Рыжская – у Каўнасе, Таліне (Рэвелі), Мінску і Пскове. Кожная камерцыйная кантора мела філіялы і аддзяленні. Напрыклад, мінская кантора ўключала 9 філіялаў і 61 аддзяленне.

Толькі за першы год работы ЦГТ «Усход» значна павялічыліся яго штаты. Прычым зроблена гэта было за кошт прыцягнення мясцовых жыхароў, у тым ліку былых служачых савецкіх нарыхтоўчых кантор «нарыхтзярно», «нарыхтжывёла», «нарыхтптушкапрадукт» і інш. У колькасным выражэнні суадносіны нямецкіх і мясцовых служачых у «Остландзе» выглядалі як 1 да 97, а на тэрыторыі інспекцыі – як 1 да 29, у рэйхскамісарыяце «Украіна» – 1 да 115. З восені 1941 г. ЦГТ адказвала за шэраг перапрацоўчых вытворчасцей мясной прадукцыі ў Мінску, Гомелі, Баранавічах і Барысаве. Са снежня паўнамоцтвы манапольнага аб'яднання пашыраюцца таксама на прадпрыемствы па перапрацоўцы воўны, льну, канапель, скуры, меха і інш. Усяго ў генеральнай акрузе «Беларусь» і ў раёне тылу групы армій «Цэнтр» дзейнічаў 21 філіял ЦГТ «Усход» і «Усход-Цэнтр» з 146 аддзяленнямі, а таксама каля 5,5 тыс. баз, сховішчаў, магазінаў і пунктаў па прыёму сельгаспрадуктаў і фуражу. У зоне аператыўнага армейскага тылу і на тэрыторыі генеральнай акругі Беласток канторы ЦГТ не ўводзіліся [14, Bl. 12].

Пры правядзенні вытворча-гаспадарчых мерапрыемстваў у рэйхскамісарыятах «Остланд» і «Украіна» апрача ЦГТ «Усход» бралі ўдзел іншыя манаполіі: па нарыхтоўцы скур, меха, матэрыялаў жывёльнага паходжання; валакна; торфу; дрэваапрацоўкі. У адпаведнасці з загадам Герынга галоўная мэта спецыяльна створаных манапольных аб'яднанняў заключалася ў нарыхтоўцы і збыце сельскагаспадарчай прадукцыі, пастаўцы для сельскай гаспадаркі сродкаў вытворчасці і тавараў першай неабходнасці, арганізацыі ўліку і ацэнкі якасці натуральнай прадукцыі жывёльнага паходжання, а таксама вытворчасці і перапрацоўкі сыравіны для тэкстыльнай прамысловасці і інш.

Акупацыйная адміністрацыя не выключала магчымасцей увядзення эканамічных метадаў гаспадарання, перш за ўсё на аснове стварэння банкаўскай сеткі. Так, да лета 1942 г. для фінансавага забеспячэння гаспадарчай дзейнасці на тэрыторыі інспекцыі «Цэнтр» і генеральнай акругі Беларусь была створана сетка з 72 банкаўскіх аддзяленняў і крэдытных кас. 25 верасня 1942 г. у Мінску адкрываецца філіял аб'яднанага банка «Остланда». У 1943 г. іх колькасць павялічваецца да 100. Банкамі і іх аддзяленнямі на акупаванай тэрыторыі Беларусі праводзілася крэдытаванне важнейшых галін вытворчасці, перш за ўсё – сельскай гаспадаркі, будаўніцтва, дрэваапрацоўкі, а таксама асобных прамысловых і гандлёвых прадпрыемстваў.

Аднак толькі беспаваротны крах вермахта на савецка-германскім фронце летам 1943 г. з'явіўся для нацысцкага кіраўніцтва адной з прычын ліквідацыі гаспадарчых каманд і гаспадарчай інспекцыі «Цэнтр» (31.10.1943). З вызваленнем Беларусі летам 1944 г. быў цалкам ліквідаваны германскі ваенна-гаспадарчы апарат гвалту, рабавання і эксплуатацыі.

Такім чынам, на значнай частцы тэрыторыі Беларусі, якая з 22 чэрвеня 1941 па 28 ліпеня 1944 г. знаходзілася пад кантролем германскай акупацыйнай улады, быў створаны мабільны ваенна-гаспадарчы апарат, які *бессістэмна* эксплуатаваў людскі патэнцыял, рабаваў і разбураў эканамічныя рэсурсы беларускай зямлі.

Найбольш паслядоўную палітыку германскія акупанты праводзілі ў галіне сельскай гаспадаркі, якая з'яўлялася адзінай крыніцай «забеспячэння войскаў з рэсурсаў краіны».

Выходнай пазіцыяй для ўсіх гаспадарчых органаў, якія з першых дзён акупацыі пачалі нарыхтоўчую дзейнасць на тэрыторыі Беларусі, з'яўляліся дырэктыўныя ўказанні аб харчовым забеспячэнні групы армій «Цэнтр». Штодзённа (па стану на канец жніўня 1941 г.) для яе неабходна было пастаўляць: 1200 галоў буйной рагатай жывёлы (+20%), 7500 ц зерня (+20%), 24000 ц бульбы, 9600 ц масла і тлушчаў, 24000 ц аўсу і 20000 ц сена [15, Bl. 3 R.].

Пры гэтым, калі ваенна-эканамічнае кіраўніцтва германскага рэйха першапачаткова патрабавала ад нарыхтоўчых службаў забяспечыць 2/3 патрэбнасцей вермахта ў сельгаспрадукцыі, атрыманай з акупаванай тэрыторыі, то з сярэдзіны верасня 1941 г. – на 100% [16, Bl. 8]. Прадвызначанасць у гэтым пытанні не прывяла ваенна-эканамічнае кіраўніцтва рэйха да рашэння другой задачы: да канца года ўводзіць для ўсяго насельніцтва абавязацельствы па «татальных» пастаўках ці для кожнай беларускай сям'і вызначыць цвёрдыя нормы здачы харчовай прадукцыі.

З першых дзён знаходжання на акупаванай тэрыторыі Беларусі германскім гаспадарчым апаратам пачаўся ўлік не толькі наяўнай сельгаспрадукцыі, але і перапрацоўчых вытворчасцей. Да канца года былі ўзяты на ўлік усе калгасы і саўгасы, праведзена інвентарызацыя іх тэхнічнай

аснашчанасці і наяўнасці цяглавай сілы, але самае галоўнае – вызначаны стан рабочай сілы ў разліку на кожныя 100 га ворнай зямлі і сельскагаспадарчых угоддзяў. У выніку атрымалася, што на акупаванай тэрыторыі Беларусі былі выяўлены 10249 калгасаў, найбольш значная доля якіх (9/10) знаходзілася ў тылавым раёне групы армій «Цэнтр». Менш за ўсё калгасаў (1/100) узялі на ўлік на тэрыторыі гебітскамісарыятаў Брэст і Пінск.

Пасля праведзенага ўліку наяўнасці рабочай сілы, якая заставалася на акупаванай тэрыторыі Беларусі, эканамічным штабам «Усход» вызначаўся агульны аб'ём паставак сельгаспрадукцыі. Пры гэтым улічвалася, што ў генеральнай акрузе Беларусь быў адзін з самых высокіх паказчыкаў па ступені канцэнтрацыі працоўнай сілы на 100 га усіх сельгасугоддзяў – 40,9% (у «Цэнтры» – 28,4%), пры сярэдняй велічыні ў 26,3% на ўсёй акупаванай усходняй тэрыторыі. Да таго ж, у генеральнай акрузе Беларусь аказаўся самы высокі паказчык па выкарыстанні працоўнай сілы на 100 га пашні – 78,0% (на тэрыторыі інспекцыі «Цэнтр» – 49,2%), пры сярэднім паказчыку 39,5%. Па выніках 1942 г. гэты паказчык складаў 72% у генеральнай акрузе Беларусь ці ў абсалютных лічбах 470000 чалавек [17, Bl. 27665] (у рэйхскамісарыяце «Украіна» – 33,8%).

З пачатку восені 1942 г. адказнасць за рашэнне задачы па харчовым забеспячэнні воінскіх часцей разам з гаспадарчымі службамі вермахта і цывільнай адміністрацыі ўскладвалася на канторы ЦГТ «Усход»: ім было прадпісана правядзенне работ па цэнтралізаванай нарыхтоўцы сельгаспрадукцыі на аснове закупак у мясцовага насельніцтва зерня, жывёлы, мяса, масла, тлушчаў. Аднак на практыцы ўсё было інакш. Быў уведзены неадэкватны абменны курс рубля і рэйхсмаркі, дзейнічалі нерэальныя кошты на сельгаспрадукцыю, праводзіліся пастаянныя рэквізіцыі гатовай прадукцыі ў сялян без адпаведных выплат і г. д.

Для беларускага селяніна ўстанаўліваліся абавязковыя нормы здачы сельгаспрадукцыі, якія не былі пастаяннымі. Напрыклад, першапачаткова сярэдняя норма па зерню для раёнаў Мінска і Брэста складала 3 ц з 1 га, у раёне гаспадарчай інспекцыі «Цэнтр» – ад 100 да 180 кг, па бульбе – ад 2 да 12 ц з 1 га [18]. У раёне Бабруйска патрэбна было здаць 4 ц зерня і 15 ц бульбы з 1 га, а таксама 80 кг мяса і 400 л малака з аднаго двара. У 1943/44 гаспадарчым годзе гэтыя лічбы для генеральнай акругі Беларусь складалі: 85 кг зерня з 1 га, 160 кг бульбы, 6–7 кг мяса – з 1 кастрычніка, але пры гэтым за першыя тры месяцы патрэбна было здаць 60% зерня і 40% мяса.

Жорсткія патрабаванні, прад'яўленыя акупацыйнымі гаспадарчымі органамі да беларускіх сялян у адносінах выканання імі цвёрдых норм здачы зерня, мяса, малака, масла, тлушчаў і г. д., прыводзілі да катастрафічнага стану на сяле. Напрыклад, пасля здачы абавязковых паставак у генеральнай акрузе Беларусь на аднаго чалавека ў сярэднім заставалася толькі 100 кг зерня і крыху больш бульбы. У паўднёвых раёнах Беларусі зерня ў пераліку на сялянскае насельніцтва заставалася ад 110 да 160 кг [19, s. 245]. У выпадку невыканання гэтых норм у адносінах кожнага асобнага селяніна ці ўсёй вясковай абшчыны ўводзіліся штрафныя санкцыі ці выкарыстоўваліся прымусовыя меры, пакідаючы тым самым беларускіх сялян без прадуктаў харчавання і асуджаючы іх разам з сем'ямі на галодную смерць толькі дзеля атрымання лішкаў прадуктаў для вермахта і рэйха. Грубы сабатаж ці невыкананне ваенных паставак вялі да жорсткіх штрафных санкцый з выкарыстаннем грашовых штрафаў, рэквізіцыі жывёлы і інвентару, высялення з вёскі, прыцягнення да прымусовых работ ці арышту.

Нздольнасць гаспадарчых органаў вырашаць праблемы, выкарыстоўваючы для гэтага толькі адміністрацыйныя ці прымусовыя меры, прывяла германскае кіраўніцтва да змянення эканамічнай палітыкі ў адносінах сялян. З мэтай павышэння вытворчасці працы сялян з лютага 1942 г. уводзіцца «новы аграрны парадак землекарыстання».

У «Дырэктывах па практычным правядзенні мерапрыемстваў з мэтай вядзення новага землекарыстання» [20, k. 647] аб'яўлялася аб роспуску калгасаў і стварэнні аднаасобных гаспадарак. Новы парадак землекарыстання прадугледжваў рэфармаванне калгасаў і саўгасаў у земляробчыя таварыствы, зямельныя кааператывы і хутарскія гаспадаркі. Замест традыцыйнага трохполля ўводзілася шасціпольная сістэма апрацоўкі зямлі. Пры гэтым для кожнай гаспадаркі папярэдне даводзіліся канкрэтныя нормы абавязковых паставак сельгаспрадукцыі.

Асаблівасцю рэфармавання сельскай гаспадаркі на тэрыторыі Беларусі было тое, што цалкам «новы парадак» землекарыстання ўводзіўся толькі ў раёнах дзеяння ваеннай адміністрацыі

толькі часткова ў генеральнай акрузе Беларусь (за выключэннем раёнаў Мінска, Слуцка і Барысава). Для большай часткі акругі, якая раней была «польскай», гэта мерапрыемства не мела значэння, паколькі на гэтай тэрыторыі быў улічаны толькі 641 калгас, ці больш за 6% ад іх агульнай колькасці на ўсёй акупаванай тэрыторыі Беларусі. Правядзенне аграрнай рэформы тут не прадугледжвалася. З вялікімі затрымкамі ўводзіўся «новы парадак» і на тэрыторыі генеральнай акругі Жытомір. У той жа час пры гаспадарчай інспекцыі «Цэнтр» для каардынацыі і правядзення запланаваных мерапрыемстваў быў створаны спецыяльны штаб [21, Bl. 115], у генеральнай акрузе Беларусь гэтыя задачы вырашаліся аддзеламі «харчавання» і «сельскай гаспадаркі». На месцах арганізатары выкарыстоўвалі былы савецкі сельскагаспадарчы кіруючы апарат, перш за ўсё землябаў і аграномаў.

Паводле дакументаў эканамічнага штаба «Усход», на тэрыторыі генеральнай акругі Беларусь і гаспадарчай інспекцыі «Цэнтр» планавалася першапачаткова стварыць таварыствы ў 10% гаспадарак (на Украіне – 1%); пры гэтым ужо ў лютым 1942 г. гаспадарчай інспекцыі «Цэнтр» трэба было рэфармаваць 50% калгасаў і саўгасаў. Фактычна да канца лета на тэрыторыі генеральнай акругі (у раёнах Мінска, Слуцка і Барысава) і гаспадарчай інспекцыі былі рэфармаваны 100% калгасаў і саўгасаў (на Украіне – ад 10 да 20%). Пры гэтым кожнай абшчыннай гаспадарцы прадпісвалася да пачатку красавіка (даты пачатку новага сельскагаспадарчага года. – *С. Н.*) выканаць абавязковыя сельскагаспадарчыя пастаўкі, якія ўключалі: па жывёльнай прадукцыі – мяса, птушку, рыбу, яйкі, мёд, шэрсць, малако; па раслiннай – зерне, фураж, грэчка, авёс, проса, бобовыя, насенне масляністых культур, лён, канапель, сена, салому, бульбу, гародніну [22, Bl. 81].

У генеральным камісарыяце Беларусь аснову для планавага выканання заданняў па сельскагаспадарчай прадукцыі бачылі ва ўвядзенні сістэмы «абшчыннага кіравання» вытворчасцю зерня, мясной і мясамалочнай прадукцыі, бульбы, яек, шэрсці, ільну і пянькі. 19 красавіка 1942 г. генеральны камісар выдаў адпаведныя распараджэнні, якімі абавязваў гебітскамісараў, зямельныя ўпраўленні і таварыствы, канторы і пункты ЦГТ «Усход» пачаць у акрузе планавую вытворчасць сельгаспрадукцыі.

Іх выкананне азначала, што з вясны 1942 г. у цэнтры ўвагі выканаўчых органаў на акупаванай тэрыторыі Беларусі аказалася не столькі нарыхтоўка сельгаспрадукцыі, колькі яе непасрэдная вытворчасць і перапрацоўка. З гэтай мэтай ЦГТ «Усход» бярэ пад свой кантроль усе прадпрыемствы па нарыхтоўцы, перапрацоўцы і вытворчасці сельгаспрадукцыі на тэрыторыі генеральнай акругі Беларусь. Да канца 1943 г. іх колькасць складала 3536 адзінак, прычым асноўнай рабочай сілай на іх былі мясцовыя жыхары. Больш усяго перапрацоўчых аб'ектаў знаходзілася на тэрыторыі гебітскамісарыята Ліда – 1105, у той час як на тэрыторыі слуцкай акругі –175, мінскай (раённай) – 174, вілейскай – 158 і ганцавіцкай – 62 [23, Bl. 37–47, 75–77].

Найбольш буйныя вытворчасці па перапрацоўцы сельгаспрадукцыі знаходзіліся ў Мінску. Так, летам 1943 г. пад кантролем ЦГТ «Усход» у горадзе знаходзілася 11 прадпрыемстваў, на якіх працавалі 1464 рабочыя і служачыя. На працягу года на хлебазаводзе «Аўтамат», двух мукамольных камбінатах, піўзаводзе, малаказаводзе, птушкафабрыцы, кансервавай і дражджавой фабрыках, бойні і халадзільніку сярэдняя штомесячная занятасць вагалася ад 1100 да 1200 чалавек. Па колькасці спецыялістаў, кваліфікаваных рабочых і навучэнцаў, а таксама занятага тэхнічнага персаналу самымі вялікімі вытворчасцямі ў жніўні 1943 г. былі: Мінскі піўзавод – 252 (з іх рабочых – 219), хлебакамбінат «Аўтамат» – 247 (204), мукамольны камбінат № 4 – 176 (128), малаказавод – 151 (106). Менш за ўсё персаналу працавала на дражджавой фабрыцы – 17, птушкафабрыцы – 25, халадзільніку – 32 чалавекі. Самым вялікім прадпрыемствам у сістэме ЦГТ з'яўлялася бойня ў Мінску, дзе на канец чэрвеня былі заняты 339 чалавек [24].

Статыстычныя справаздачы эканамічнага штаба «Усход» даюць магчымасць убачыць агульную карціну выканання асноўных харчовых паставак з акупаванай тэрыторыі Беларусі ў рамках планавых заданняў на 1941/42, 1942/43 і 1943/44 гаспадарчыя гады. Так, амаль за 3 гаспадарчых гады ў генеральнай акрузе Беларусь заданне па зерню было выканана на 41% (у «Остландзе – на 83%, у Украіне – на 106%). Агульны аб'ём нарыхтаванага зерня (без фуражу), адпраўленага вермахту і ў рэйх з Беларусі (без уліку генеральных акруг Валынь-Падолія і Жытомір), склаў 46,9% ад першапачатковых заданняў ці больш за 500 тыс. тон. Як паказваюць дакументы, значнымі

пастаўкі былі толькі ў 1942 г., калі вайсковыя часці вермахта групы армій «Цэнтр» атрымалі «з краіны»: хлеба – 60%, фуражу – 20, мяса – 65, бульбы – 90, тлушчаў – 10, а таксама сена – 40 і саломы – 20%. Па нашых падліках, за тры гады акупацыі з тэрыторыі інспекцыі «Цэнтр» быў атрыманы ўраджай зерневых у 3888,6 тыс. т, з якіх на долю Беларусі прыпадала 58,6%. Пры гэтым у 1943 г. ураджай зерневых складаў толькі 28,6% у адносінах да 1942 г. За два першыя гаспадарчыя гады з усёй тэрыторыі інспекцыі «Цэнтр» было таксама атрымана 3696,5 тыс. т бульбы [25, Bl. 11 R.].

Невыкананне абавязковых паставак было адным з бакоў агульнай праблемы ў галіне забеспячэння германскіх вайсковых часцей з захопленых тэрыторый. Другі бок усё больш адметна праяўляўся на прыкладзе ўзрастання страт ужо нарыхтаванай прадукцыі. Калі ў 1941/42 гаспадарчым гадзе такія страты былі нязначнымі, то з 1942 г. яны прыметна ўзраслі: галоўнай прычынай гэтага з'яўлялася барацьба партызан і мясцовага насельніцтва супраць непасільных заданняў і паставак сельгаспрадукцыі. Так, у справаздачы начальніка галоўнага аддзела III генеральнага камісарыята Беларусь Фрайтага ад 28 чэрвеня 1943 г. адзначана, што з агульнага аб'ёму выкананых заданняў нарыхтовак за 1942/43 гаспадарчы год было знішчана ці захоплена: зерня – 20%, бульбы – 5, мяса – 11, тлушчаў – 10, а таксама сена – 41 і саломы 50%.

Апрача таго, акупанты не спыняліся пры выбары сродкаў і метадаў эксплуатацыі беларускага сялянства. З дапамогай ваенна-паліцэйскіх фарміраванняў і часцей СС у Беларусі за гады акупацыі было праведзена больш за 140 буйных карных аперацый, мэтай якіх, як сведчаць дакументы, з'яўляліся і рэсурсы сельскай гаспадаркі.

Агульная карціна аграрна-вытворчых адносін на акупаванай тэрыторыі Беларусі будзе няпоўнай, калі абысці маўчаннем «сістэму пабораў». Для мясцовага насельніцтва органамі акупацыйнай улады былі ўстаноўлены: 1) сістэма натуральных і грашовых пабораў, 2) сістэма прымусовых канфіскацый і 3) сістэма прымусовых паставак. Зазначым таксама, што агульная колькасць падаткаў і розных страховак не была пастаяннай і залежала ў асноўным ад мясцовай адміністрацыі. Напрыклад, з жыхароў пінскай акругі на працягу трох гадоў акупацыі збіралася 19 розных відаў страховак і падаткаў на агульную суму каля 100 млн рублёў/карбованцаў.

Аднак ні прымусовыя меры, ні штрафныя санкцыі, ні спробы ўвядзення новага парадку землекарыстання, ні спробы пастаўкі селекцыйных сартоў зерня, ні замена племянной жывёлы, ні ўвоз сельгасмашын і г. д. – нішто з таго, што выкарыстоўвалася германскімі акупацыйнымі органамі і іх гаспадарчымі структурамі, не прывяло да поўнага выканання «Дырэктыў па вядзенні гаспадаркі» на тэрыторыі Беларусі. Не дало чаканых вынікаў і рашэнне германскага ўрада аб ўвядзенні з лета 1943 г. уласнасці на зямлю. Хаця агульныя вынікі выканання планавых заданняў на 1942/43 гаспадарчы год з беларускай тэрыторыі інспекцыі «Цэнтр» і генеральнай акругі Беларусь складалі: па зерню – 40 і 41% адпаведна, па мясу – 36 і 25, па маслу – 45 і 80, па тлушчах – 70 і 68% [26, Bl. 134]. Пры гэтым акупанты не атрымалі значную частку канфіскаваных сельгаснарыхтовак у выніку знішчэння нарыхтаванай прадукцыі партызанамі, падпольшчыкамі і мясцовым насельніцтвам.

У выніку актывізацыі дзейнасці партызанскага супраціўлення на тэрыторыі Беларусі рэзка скараціліся сельскагаспадарчыя плошчы, якія раней знаходзіліся пад кантролем акупантаў. Так, згодна з дакументальнымі матэрыяламі гаспадарчых каманд «Віцебск» і «Орша», у 1941/42 гаспадарчым годзе было выканана 35% ад агульнага аб'ёму заданняў па нарыхтоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі і фуражу. Праз год (па стану на 03.06.1943) сітуацыя радыкальна змянілася. На тэрыторыі гаспадарчай каманды «Віцебск» пасяўныя плошчы зменшыліся ў 4,9 раза, у той час як усе выкарыстаныя сельскагаспадарчыя ўгоддзі ў 5,2 раза, хаця ўраджайнасць зерневых культур склала ў сярэднім больш 7 ц з 1 га [27, Bl. 11, 11 R.].

У ходзе падрыхтоўкі да эвакуацыі і адступленні з акупаванай тэрыторыі Беларусі германскія гаспадарчыя службы значна ўзмацнілі ступень эксплуатацыі беларускай вёскі. Напрыклад, за 2 месяцы да заканчэння тэрмінаў здачы заданняў на 1943/44 гаспадарчы год гебітскамісар Эрэн у Слоніме адзначаў, што у складаных умовах узмацнення партызанскай барацьбы заданне па нарыхтоўцы важнейшых відаў сельгаспрадукцыі было выканана: па зерню – на 72,5%, фуражу – на 108,4, бульбы – 80,7, гароднiне – на 76,6, а таксама па сену – на 77,5 і па саломе – на 97%.

У выніку татальнай эксплуатацыі беларускай вёскі, якая патрапіла пад германскую акупацыю, былі катастрафічна скарочаны яе вытворчыя рэсурсы. За тры гады акупацыі, па ацэнцы нямецкага даследчыка Х. Герлаха, Беларусь панесла самыя значныя страты [28, s. 327].

Пра маштабы злачынстваў акупацыйных ваенна-гаспадарчых органаў сведчаць шматлікія дакументальныя матэрыялы: у 1941–1944 гг. у жыхароў Беларусі было рэквізавана, забіта і выгнана буйной рагатай жывёлы, коней, свіней, авечак і коз – 5638 тыс. галоў на агульную суму 4096 млн рублёў, разрабавана запасаў зерня, мукі, бульбы, гародніны і садавіны – 5130 тыс. т на суму 3100 млн рублёў. Усяго калгасам у Беларускай ССР былі прычынены ўрон на агульную суму каля 20 млрд рублёў (у цэнах 1941 г.) [29, с. 422–423].

Аднак ніякімі лічбамі немагчыма змерыць маштабы людской трагедыі беларускага сялянства, якое ў гады германскай акупацыі вынесла на сабе ўвесь цяжар гаспадарчых рэквізіцый, рабавання, разбурэнняў, гвалту і злачынстваў. Сялянства вымушана было прайсці выпрабаванне не толькі злачыннымі метадамі германскага ваенна-паліцэйскага рэжыму, але і нацысцкай практыкай прымусу, рабавання, гвалту і эксплуатацыі. Але нават у такіх фатальных умовах менавіта сялянства Беларусі як магло забяспечвала сельгаспрадукцыяй шматтысячную армію партызан.

Прамысловы патэнцыял на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў адрозненне ад сельскагаспадарчага становіцца аб'ектам пастаяннай увагі з боку ваеннай і цывільнай адміністрацый толькі пасля збою «бліцкрыгу» восенню 1941 г., і асабліва пасля павароту пад Масквой, канчатковага правалу плана захопу СССР.

У адпаведнасці з «прынцыпамі эканамічнай палітыкі для новазанятых усходніх тэрыторый», уведзенымі 8 лістапада 1941 г., «вышэйшым законам ваеннай эканомікі» станавілася максімальнае выкарыстанне як вытворчага патэнцыялу, так і людскіх рэсурсаў з занятых савецкіх тэрыторый, у тым ліку пачалося правядзенне палітыкі па «наладжванню работы прамысловасці Беларусі» [30, s. 333].

Геаграфія прамысловай вытворчасці, уведзенай у строй да лета 1942 г. на ўсёй акупаванай тэрыторыі гаспадарчай інспекцыі «Цэнтр» (уключна РСФСР), паказвае: колькасць і канцэнтрацыя прамысловых прадпрыемстваў узрасталі па напрамку з усходу на захад і з поўначы на поўдзень. Так, на тэрыторыі галаўной каманды «Віцебск» знаходзілася каля 1/6 усіх прадпрыемстваў з колькасцю занятых 5100 чалавек (каля 11,4%). На тэрыторыі дзейнасці каманды «Орша» працавала 159 прадпрыемстваў (30%) з 16200 занятымі (36,5%). Найбольшая колькасць прадпрыемстваў была ў зоне дзейнасці каманды «Бабруйск» – 173 (32,3%), на якіх працавалі 18800 чалавек (42,3%). Усяго на тэрыторыі гэтых галаўных каманд былі заняты 40100 чалавек, ці 90,5% ад іх агульнай колькасці, з якой 1/3 складалі жанчыны. Характэрна, што да канца жніўня 1942 г. на тэрыторыі каманд знаходзілася звыш 4/5 усіх прадпрыемстваў і больш 9/10 усіх занятых ад агульнай колькасці занятых у прамысловай вытворчасці гаспадарчай інспекцыі «Цэнтр».

На акупаванай тэрыторыі Беларусі (гаспадарчай інспекцыі «Цэнтр» і генеральных акруг – Беларусь, Валынь-Падолія і Жытомір) агульная колькасць прадпрыемстваў на канец 1942 г. перавышала 800, на якіх былі заняты больш за 150 тыс. чалавек. Але ў айчыннай гістарыяграфіі пытанне аб колькасці прадпрыемстваў пакуль застаецца адкрытым. Так, у статыстычнай справаздачы вядучай групы «эканоміка» эканамічнага штаба «Усход» запісана: на пачатак 1943 г. у генеральнай акрузе Беларусь было 262 прадпрыемствы з агульнай колькасцю 9925 рабочых. У беларускай гістарыяграфіі замацавана лічба ў 60 прадпрыемстваў. Нямецкі гісторык Х. Герлах прыводзіць даныя аб тым, што ў генеральнай акрузе Беларусь у пачатку 1943 г. было ад 100 да 300 цэнзавых прадпрыемстваў, на якіх працавалі ад 7 да 12 тыс. чалавек. У працы «Беларускія остарбайтэры», адзначанай Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь за 2002 г., прыводзяцца звесткі пра тое, што «ў пачатку 1943 г. на прамысловых прадпрыемствах генеральнай акругі працавала больш за 100 тыс. чалавек» [31, с. 68]. Пры гэтым большая частка прадпрыемстваў былі цэнзавымі (больш 20 чалавек. – *С. Н.*).

Самае вялікае прадпрыемства знаходзілася ў Мінску. Ужо ў пачатку кастрычніка 1941 г. каманда на ўзбраеннях «Мінск» паведамляла, што ў горадзе зноў уступілі ў строй 51 прадпрыемства [32, Bl. 47]. Праз год – больш 130 з 55 тыс. чалавек мясцовага насельніцтва, 10 тыс. яўрэяў мінскага гета і 2 тыс. ваеннапалонных. На канец сакавіка 1943 г. у акупаваным горадзе было 140 пра-

мысловых аб'ектаў, дзе працавалі 35 тыс. чалавек, да таго ж, 8500 яўрэяў і 3190 ваеннапалонных (пры агульнай колькасці насельніцтва горада 105 тыс. – *С. Н.*). Аднак гарадскім уладам не хапала амаль 6000 спецыялістаў і ад 2 да 4 тыс. рознарабочых. Пры гэтым большасць прадпрыемстваў былі цэнзавымі. Колькасць занятых на іх вагалася да 20 да 5 тыс. чалавек. З дакументаў бачна, што адным з фактараў, які садзейнічаў часоваму пашырэнню тэхнічнай базы прамысловасці на акупаванай тэрыторыі Беларусі, быў увоз абсталявання з захопленых расійскіх і украінскіх абласцей, якія немцы пакідалі пры адступленні.

Апошняя лічба занятых была запланавана для выканання ў рамках спецыяльнай «праграмы па вытворчасці транспартных сродкаў» у Мінску [33, Bl. 24]. У адпаведнасці з сакрэтным загадам вярхоўнага камандавання вермахта (№ 855 ад 03.04.1942 г.) Якабу Верліну (генеральны ўпаўнаважаны па вытворчасці спецыяльнай тэхнікі, дырэктар завода «Даймлер Бенц» – «Daimler Benz») даручалася на працягу 1942 г. увесці ў строй адно з «самых вялікіх прадпрыемстваў «Остланда» – рамонтны ваенны завод «Gross-K-Werk». Маштабы будаўніцтва вызначаліся, як пацвярджаюць дакументы каманды па ўзбраеннях «Мінск», геаграфіяй знаходжання горада (каля 600 км ад ліні фронту) і ўсё ўзрастаючай патрэбай у рамонце ваеннай тэхнікі і ўзбраенняў: планавалася штомесячна рамантаваць 100 танкаў, а таксама займацца рамонтам рознай тэхнікі (цягачоў, легкавых і грузавых аўтамабіляў, матацыклаў) і розных узбраенняў [34, Bl. 32].

У чэрвені 1942 г. на ўзвядзенні 30 закрытых памяшканняў агульнай плошчай не менш 76 тыс. $м^2$ працавала 11 спецыяльных нямецкіх будаўнічых фірм з ўдзелам больш за 300 спецыялістаў. Акрамя таго, былі задзейнічаны рэгулярныя часці будаўнічай арганізацыі Тодта. Толькі за 3 месяцы з пачатку красавіка да канца чэрвеня на працоўную пляцоўку былі дастаўлены 284 вагоны з тэхнікай, абсталяваннем і будаўнічымі матэрыяламі, што было значна больш таго, што за гэты ж час паступіла для ўсіх аб'ектаў на тэрыторыі гаспадарчай інспекцыі «Цэнтр». У пачатку кастрычніка 1942 г. на будаўніцтве былі заняты больш за 3500 рабочых, у тым ліку: 1050 савецкіх ваеннапалонных і 2463 цывільных рабочых, з якіх: немцаў – 878, палякаў – 429, французаў і італьянцаў – 104, беларусаў 932 (у тым ліку 165 жанчын і 107 дзяцей). Але гэтай колькасці рабочых не хапала, аб чым сведчаць заяўкі з генеральнай акругі Беларусь на пастаўку працоўнай сілы колькасцю ад 500 да 4500 чалавек [35, Bl. 89]. Тым не менш ва ўзведзеных цэхах ужо летам 1942 г. былі пачаты рамонтныя работы, якія працягваліся да наступлення савецкіх войск летам 1944 г.

Разглядаючы геаграфію дзеючых прамысловых прадпрыемстваў, важна зазначыць тое, што на акупаванай тэрыторыі Беларусі, апрача Мінска, знаходзіліся, напрыклад: «самае буйное торфапрадпрыемства» – Асінторф (4000 чалавек), «буйнейшы дрэваапрацоўчы камбінат» – Бабруйск (да 2000), а таксама фанерная фабрыка ў Пінску (1100), Пінская суднаверф (900), металаапрацоўчы завод у Бабруйску (872), цэментны завод у Крычаве (677), запалкавая фабрыка ў Гомелі (588), металакамбінат у Магілёве (493), канатная майстэрня ў Ветцы (460 чалавек) [36, Bl. 10 R., 12, 13] і інш.

У канцы 1942 г. на тэрыторыі Беларусі склалася галіновая спецыфіка прамысловай вытворчасці. Вядучай галіной з'яўляліся торфанарыхтоўкі: калі ў 1942 г. колькасць занятых на 72 вытворчасцях складала больш 1/3 (36,3%), то менш чым праз год – больш паловы (52,1%) ад агульнай колькасці занятых ва ўсіх сферах вытворчасці на тэрыторыі інспекцыі «Цэнтр». За торфанарыхтоўкамі стаяла тэкстыльная галіна: тут пры агульным росце колькасці прадпрыемстваў з 106 да 126, колькасць занятых складала 9526 чалавек. Трэцюю пазіцыю ў гэтай структуры займала вытворчасць будматэрыялаў, колькасць прадпрыемстваў у якой павялічылася ў 2,1 раза (з 67 да 143), а колькасць занятых – у 1,8 раза (з 2824 да 5126 чалавек) і г. д.

Аднак пажаданага выніку ў сферы прамысловасці, хаця часткова аднаўленай і ўведзенай у строй на акупаванай тэрыторыі Беларусі, кіраўніцтва эканамічнага штаба «Усход» і гаспадарчай інспекцыі «Цэнтр» так і не атрымалі. У першую чаргу гэта адносіцца да такой стратэгічна важнай галіны, як ільнаводства. Як вядома з дакументаў, яго прадукцыя шырока выкарыстоўвалася ў Германіі пры выпуску падводных лодак. Аднак беларускае сялянства пастаянна змяншала пасяўныя плошчы на лён, паколькі імкнулася забяспечыць сябе ў першую чаргу зернем і бульбай.

Больш усяго Беларусь была вядома пастаўкамі лесу і прадукцыі дрэваапрацоўкі. Хаця партызаны ўжо вясной 1942 г. паралізавалі нарыхтоўку і сплаў драўніны ў тыле групы армій

«Цэнтр», вясной 1943 г. на гэтай тэрыторыі Беларусі пад кантролем партызан заходзілася 90% лясных масіваў. Разам з тым, з статыстычных матэрыялаў эканамічнага штаба «Усход» вынікае, што Беларусь з'яўлялася важнай крыніцай паставак лесу ў Украіну: у Днепрапятроўск, Запарожжа, Сталіна (Данецк). Так, на вясну 1943 г. з раёнаў Барысава, Оршы, Магілёва, Бабруйска і Гомеля чарговая пастаўка складала амаль 3000 вагонаў [37, Bl. 84].

У генеральнай акрузе Беларусь заданні па нарыхтоўцы лесу, частка якога паступала ў рэйх, выконваліся ў рамках планавых практычна да лета 1944 г і складалі: у 1941/42 гаспадарчым годзе – 93%, у 1942/43 – 92 і 1943/44 – 87% [38, Bl. 82]. Пры гэтым на тэрыторыі акругі штогод працавала ад 90 да 150 лесапільных заводаў і піларам, дзе штомесячна апрацоўвалася ад 220 да 260 м$^3$ піламатэрыялаў (у разліку на адну пілараму. – *С. Н.*). Галоўнымі заказчыкамі прадукцыі выступалі папяровая прамысловасць рэйха, вермахт, уключаючы будаўнічую арганізацыю Тодта, чыгунка [39, Bl. 37].

Асаблівы інтарэс у выканаўчых органаў акупацыйнай улады выклікала лясная гаспадарка Беларускага Палесся, якое з першых дзён увядзення цывільнага кіравання ператварылася ў вузел супярэчнасцей паміж ваеннай і цывільнай адміністрацыямі, армейскім камандаваннем і ўсходнім міністэрствам, а таксама рэйхскамісарам Кохам і генеральнымі камісарамі Беларусі Кубэ і фон Готбергам. Галоўная прычына – адсутнасць неабходных лясных рэсурсаў на тэрыторыі Украіны. Апрача таго, на тэрыторыі Беларускага Палесся, якое да вясны 1944 г. уваходзіла ў склад «паўночна-ўкраінскіх» генеральных акруг Валынь-Падолія, Жытомір і было ў распараджэнні інспекцыі па ўзбраеннях «Украіна», асаблівае значэнне мелі прадпрыемствы Кобрына і Пінска, дзе выконваліся заказы вермахта [40, Bl. 100–105].

Недахоп у кваліфікаваных спецыялістах быў асабліва вострай праблемай, з-за якой затрымлівалася выкананне вытворчых заданняў. З канца лета 1942 г. у акруговых камісарыятах з мэтай ліквідацыі дэфіцыту ў спецыялістах была арганізавана прафесійная падрыхтоўка моладзі. Аднак гэтыя меры не выратавалі сітуацыю. Як адзначаў начальнік аддзела рабочай палітыкі і сацыяльнага ўпраўлення генеральнага камісарыята Беларусь Фройдэнберг на нарадзе ў Мінску ў пачатку красавіка 1943 г., у генеральнай акрузе быў значны недахоп у кваліфікаваных спецыялістах [41, Bl. 27712].

У апошні год акупацыі ў Беларусі склалася катастрафічнае становішча з выкарыстаннем мясцовай рабочай сілы. Доля працуючых у адносінах да агульнай лічбы насельніцтва на акупаванай тэрыторыі Беларусі, паводле Х. Герлаха, складала ў Барысаве – 33%, у Оршы – 45, Суражы – 38 і Гарадку – 47,5%.

Аднак ва ўмовах германскай акупацыі колькасць тых, хто мог прыцягвацца і прыцягваўся да розных прымусовых работ, была больш значнай. Асабліва гэта датычылася ўсходняй часткі Беларусі, якая на працягу 1943 г. ператварылася ў зону армейскага аператыўнага тылу. Масавай з'явай таго часу стала татальнае выкарыстанне мясцовай працоўнай сілы, прыцягнутай прымусова да розных работ. Так, калі ў Гомелі ў красавіку 1942 г. да выканання гаспадарчых работ быў прыцягнуты кожны пяты жыхар акупаванага горада (з 54000 чалавек), то праз год – кожны трэці. Яшчэ больш катастрафічным становішча гарадскіх і сельскіх жыхароў ва ўсходняй частцы Беларусі стала пасля таго, як 6 лютага 1943 г. начальнік штаба сухапутных войск вермахта выдаў загад аб увядзенні абавязковай працоўнай павіннасці для ўсіх мясцовых жыхароў ва ўзросце ад 14 да 65 год [42, Bl. 27]. Гэта сітуацыя крайне абвастрылася на рубяжы 1943/44 гадоў, калі армейскае камандаванне патрабавала татальнага «выкарыстання працоўнай сілы без уліку ўзросту і палавых адрозненняў» для работ у прыфрантавой паласе.

Унікальнасць сітуацыі з працоўнай сілай вызначалася тым, што асноўныя работы павінны былі выконваць жанчыны і дзяўчыны, а таксама старыя і падлеткі. Апрача таго, абставіны выкарыстання працоўнай сілы набывалі надзвычайную вастрыню па розных прычынах, у тым ліку: а) у сувязі з крайнім недахопам харчавання; б) з-за нізкай аплаты, якая на справе была недастатковай на агульным фоне кошту тавараў спажывання для насельніцтва; в) у выніку зменаў, якія адбыліся на ўсходнім фронце ў сувязі з паветранымі налётамі і ўжо пачатай эвакуацыяй; г) па прычыне адсутнасці паліцэйскіх сіл, а таксама малой эфектыўнасці жорсткіх фізічных мер пакарання ў адносінах да мірнага насельніцтва.

Аб колькасці не ўлічаных працоўных рук, выкарыстаных у гады германскай акупацыі Беларусі на самых розных работах, можна весці размову вельмі ўмоўна. У апошнія гады ў беларускай гістарыяграфіі ўведзены факты аб «вялікай колькасці месцаў прымусовага ўтрымання цывільнага насельніцтва на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг.» [43, с. 3]. Але калі ў даведніку, выдадзеным у нашай краіне ў 1998 г., упершыню згаданы «сотні месцаў прымусовага ўтрымання», асабліва ў Магілёўскай, Віцебскай, Гомельскай і Мінскай абласцях, то ў той жа час у ім адсутнічаюць даныя аб агульнай колькасці цывільнага насельніцтва, прымусова выкарыстанага ў якасці працоўнай сілы на акупаванай тэрыторыі Беларусі за гады Вялікай Айчыннай вайны.

Разам з эксплуатацыяй мясцовага насельніцтва германскія акупанты пакінулі пасля сябе сляды эканамічных злачынстваў: рабаваліся, разбураліся ці вывазіліся з тэрыторыі Беларусі прамысловыя і сельскагаспадарчыя аб'екты. Увогуле за гады германскай акупацыі дзяржаўнай прамысловасці Беларускай ССР быў прычынены ўрон на суму больш за 6 млрд руб., тады як калгасам, саўгасам і МТС – каля 50 млрд рублёў (у цэнах на 1941 г.) [44, с. 420–421].

Такім чынам, мэтанакіраванае ажыццяўленне на практыцы «Дырэктыў па вядзенні гаспадаркі» стала асновай для таго, што ўсе спецыяльныя гаспадарчыя службы, ваенная і цывільная адміністрацыі, асобныя ваенна-паліцэйскія фарміраванні і часці войск СС станавіліся непасрэднымі выканаўцамі злачыннай нацысцкай палітыкі Германіі на акупаванай тэрыторыі Беларусі.

Прыведзены аналіз новых арыгінальных дакументальных матэрыялаў дае падставы для высновы: вытворчы і людскі патэнцыялы Беларусі былі не толькі аб'ектамі прамых ваенна-аператыўных дзеянняў, але і з'ўляліся *суб'ектамі* германскай ваенна-гаспадарчай палітыкі на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

## Літаратура


1. Archiv des Instituts fuer Zeitgeschichte (Інстытут сучаснай гісторыі, далей – A IfZ). A IfZ. ED 2/I. Bd. I. Kriegswirtschaft im Operstionsgebiet des Ostens in den Jahren 1941–1943.

2. Der deutsche Ueberfall auf die Sowjetunion. Frankfurt a. M., 1999.

3. Verbrechen der Wehrmacht. Dimensionen des Vernichtungskriges 1941–1944. Ausstellungskatalog. Hamburg, 2002.

4. Bundesarchiv-Militaerarchiv (Федэральны ваенны архіў Германіі, далей BA-MA): BA-MA. RW 31/128. Richtlinien fuer die Fuehrung der Wirtschaft in den neubesetzten Ostgebieten (Gruene Mappe). Teil I: Aufgaben und Organisation der Wirtschaft. Juni 1941 (1. Auflage).

5. Расійскі дзяржаўны ваенны архіў (далей – РДВА). РДВА К (гісторыка-дакументальная калекцыя), ф. 1358 к, воп. 4, спр. 1: BfdVP, Wi Fue Stab Ost, V. P. 19206/6 g v. 20.11.41 (Abschrift).

6. BA-MA. RW 31/134. Der Reichsminister fuer die besetzten Ostgebiete, III Wi. 2461/42. Die Zivilverwaltung in den besetzten Ostgebieten (Braune Mappe). Teil A: Richtlinien fuer die Wirtschaftsfuehrung. Berlin, April 1942.

7. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НА РБ), ф. 370, воп. 1, спр. 777, л. 1–2; спр. 35, л. 45; спр. 1837, л. 112; спр. 815, л. 11; ф.412, воп. 1, спр. 5, л. 86; спр. 36, л. 17; спр. 50, л. 1; спр. 33, л. 218; ф. 510, воп. 1, спр. 65, л. 84.

8. BA-MA. RW 31/80. Richtlinien fuer die Fuehrung der Wirtschaft (Fall Barbarossa) (Anlage 2).

9. НА РБ, ф. 412, воп. 1, спр. 19: Wi In Mitte. Stellenbesetzungsplan fuer die Wi In Mitte. Stand: Anfang Juli 1941.

10. BA-MA. RW 31/302b. Wi Stab Ost, Abt. I/ Id, Nr. 90088/42. Monatsbericht fuer Oktober 1942.

11. РДВА, ф. 1358 к, воп. 4, спр. 1: BfdVP, Wirtschaftsfuehrungsstab Ost, V. P. 19206/6 g. V. 20.11.41 (Abschrifft).

12. З а г о р у л ь к о М. М., Ю д е н к о в А. Ф. Крах плана «Ольденбург»: о срыве экономических планов фашистской Германии на временно оккупированной территории СССР. М., 1980.

13. К н а т ь к о Г. «Матка, давай млеко, давай яйки!» // Народная газета. 1995. 23–25 снежня.

14. РДВА, ф. 700 к, воп. 1, спр. 48: Schreiben Ministerialdirektor Dr. Schlotterer an Herr Ministerialdirektor Dr. Gramsch v. 26.11.42.

15. BA-MA. RW 30/37, Einsatz des Wi Kdo Minsk. Erfahrungsbericht des Hptm. Dorn v. 28.8.41.

16. РДВА, ф. 700 к, воп. 1, спр. 31: Beauftragter fuer Vierjahresplan, V. P. 16098/41g. Besprechungsnotiz von Reichsmarschall mit Staatssekretaer Backe v.15.9.41 (Abschrift).

17. Bundesarchiv (Федэральны архіў Германіі, далей – BA): BA R 93/20: Der GenKW in Minsk: Protokoll ueber die Tagung der Gebietskommissare, HA-Leiter u. Abt.-Leiter des Generalkommissars in Minsk vom 8. April bis 10. April 1943.

18. BA R 93/7: Der GenKW in Minsk, Abt. III E 2, Az. II D 100, Bl. 9; BA-MA (BArchP)F 42859. Wi In Mitte, Lagebericht Nr. 20 v. 4.8.1942.

19. G e r l a c h C h. Kalkulierte Morde: die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weissrussland 1941 bis 1944. Hamburg, 1999.

20. BA-MA. F 42748. RMf bO. Die neue Agrarordnung fuer die besetzten Ostgebiete v. 15. Februar 1942.

21. НА РБ, ф. 412, воп. 1, спр. 121: Wi In Mitte, Chefgruppe La, Sondestab Agrarordnung, Fachliche Anweisung Nr. 2 v. 14. Januar 1943.

22. НА РБ, ф. 412, воп. 1, спр. 121: Wi In Mitte Chefgr. La, Sonderstab Agrarordnung, Ausfuehrungsbestimmung Nr. 7 zur Neuen Agrarordnung.

23. НА РБ, ф. 398, воп. 2, спр. 7: ZHO, Aufstellung von allen Betrieben der ZHO Treuhand auf 15.11.43.

24. НА РБ, ф. 398, воп. 2, спр. 7: ZHO, Aufstellung von allen Betrieben der ZHO Treuhand auf 15.11.43, л. 37; д. 420: Monatliche Produktions-Uebersichte fuer die Monate Maerz–August 1943.

25. РДВА, ф. 700 к, воп. 1, спр. 49: Wi Stab Ost, Abt. Rue/H, B. Nr. 92802/42g. Material von Oberst Dr. Musset v. 17.9.42 (Abschrift).

26. РДВА, ф. 700 к, воп. 2, спр. 4. Wi Stab Ost, Stab Abt. I/Ic, Br. Nr. 69700/43, Monatsbericht Wi Stab Ost (1.10.–31.10.1943) (падлікі аўтара).

27. РДВА, ф. 700 к, воп. 2, спр. 4: Wi Stab Ost, Stab Abt. I/Ic, Br. Nr. 69700/43, Monatsbericht Wi Stab Ost (1.10.–31.10.1943).

28. G e r l a c h Ch. Kalkulierte Morde: die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weissrussland 1941 bis 1944. Hamburg, 1999.

29. Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. 1941–1944. Мн., 1965.

30. Der deutsche Ueberfall auf die Sowjetunion. Frankfurt a. M., 1999.

31. НА РБ, ф. 412, воп. 1, спр. 113: Wi In Mitte Chefgruppe, Gruppe Statistik, Az. 8057, Die wirtschaftliche Struktur des Raumes der Wirtschaftsinpektion Mitte unter Zugrundelegung der Beschaeftigungszahlen nach dem Stande vom 31.8.42.

32. НА РБ, ф. 412, воп. 1, спр. 19: Rue Kdo Minsk, Gr. BB: Lagebericht fuer Monat September v. 11.10.41.

33. BA-MA. RW 30/26. Wi Rue Ostland. Wi Kdo Minsk. KTB Nr. 3: 1.1. – 31.3.1942.

34. BA-MA. RW 30/26. Wi Rue Ostland. Wi Kdo Minsk. KTB Nr. 3: 1.1. – 31.3.1942.

35. НА РБ, ф. 393, воп. 3, спр. 321: Der Bevollmaechtigte des Generalbevollmaechtigten fuer die Regelung der Bauwirtschaft, Bezirk Minsk, Sonderbau Werllin, Frontfuehrung v. 31.3.1943.

36. НА РБ, ф. 412, воп. 1, спр. 189: Wi In Mitte, Chefguppe W, Gruppe Statistik. Arbeitende Betriebe auf Grund der vorliegenden Angaben nach dem Stand vom 1.5.43.

37. РДВА, ф. 700 к, воп. 1, спр. 50: Sonderbeauftragter fuer die Holzverwaltung Sued-Ost, Abt. III, Az. 105. Holzabtransport aus dem Bereich der HGMitte zur HGrSued (Stand v. 26.03.43).

38. BA. R 6/289. Der GenKW, HA Fo u. Ho, Abwicklungsstelle. Taetigkeitsbericht ueber die seit Errichtung der Zivilverwaltung geleistete Arbeit v. 5.9.44.

39. R 93/3. Der Generalkommissar in Minsk, Abt. II Verw., Lagebericht v. 15. Oktober 1942.

40. A IfZ, MA 795. RMfbO: Schreiben Nr. 223 v. 3.6.42: Die Neuordnung fuer Handwerk in der Ukraine.

41. НА РБ, ф. 370, воп. 1, спр. 1262, л. 98; спр. 1263, л. 71; BA, R 93/20: Protokoll ueber die Tagung der Gebietskommissare, HA-Leiter u. Abt.-Leiter des Generalkommissars in Minsk vom 8. April bis 10. April 1943.

42. BA-MA. RW 31/28: Verordnung ueber Arbeitspflicht und Arbeitseisatz im Operationsgebiet der neubesetzten Ostgebiete vom 6. Februar 1943.

43. Справочник о местах принудительного содержания гражданского населения на оккупированной территории Беларуси 1941–1944 / Авт.-сост. В. И. Адамушко и др. Мн., 2001.

44. Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. 1941–1944. Мн., 1965.

*S. Y. NOVIKAW*

## ECONOMICAL POLICY OF NAZI GERMANY ON THE OCCUPIED TERRITORY OF BELARUS (1941–1944)

### Summary

On the basis of new original materials the main results of Nazi Germany economic policy on the occupied territory of Belarus in 1941–1944 are being revealed.